# Рэлігійнасць як элемент канструявання віртуальнай ідэнтычнасці

**Крывалап Аляксей Дзмітрыевіч,**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Наваполацк, Беларусь)

*Праца прысвечана разгляду сучасных практык маніфестацыі рэлігійнай прыналежнасці ў віртуальнай прасторы, як элемента для пабудовы культурнай ідэнтычнасці асобы, якая выбудоўвае сваю прысутнасць у анлайне.*

Цікаўнасць да праблемы рэлігійнай ідэнтычнасці на сённяшні дзень няўхільна расце. Напрыклад, у матэрыялах IX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Рэлігія і грамадства» слова ідэнтычнасць сустракалася толькі ў пяці дакладах. У матэрыялах X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Рэлігія і грамадства» 2016 пытанне ідэнтычнасці закранала ся ў дзевяці артыкулах.

Зразумела, што гэта пытанне закранаецца іншымі даследчыкамі і не толькі ў дачыненні да нашага рэгіёну. Так Е. Мядведзева ў сваім артыкуле «Праблема фарміравання рэлігійнай ідэнтычнасці ў кіберпрасторы» прыходзіць да цікавай высновы адносна матывацыі інтэрнэт-карыстальнікаў: «Не гледзячы на тое, што карыстальнікі канструюючы сваю рэлігійную ідэнтычнасць у сетцы, ператвараюцца ў паломнікаў, яны часта аддаюць перавагу верыць, але не належаць ні да адной рэлігіі» [1, с. 77]. Вось гэта вера без прыналежнасці і з'яўляецца аб'ектам нашага даследавання.

Мы паспрабуем разгледзець праблему маніфестацыі рэлігійнай прыналежнасці ў віртуальнай прасторы, як элемента для пабудовы культурнай ідэнтычнасці асобы, якая выбудоўвае сваю прысутнасць у анлайне. Фактычна, магчыма разважаць пра спажыванне веры, як чарговых маркёраў якія дазваляюць ствараць дадатковыя адрозненні ад іншых.

Угаданая вышэй праблема мае некалькі вымярэнняў, мы акрэслім тры магчымыя, якія ўмоўна магчыма назваць наступным чынам: 1) публічнае / прыватнае; 2) практыка / сімуляцыя і 3) штодзённасць / будучыня. Мы не можам сцвярджаць, што толькі гэты тры вымярэнні і маюць значэнне, але ж дакладна яны лепш за іншыя бачны пад час карыстання сацыяльнымі сеткамі.

1) публічнае / прыватнае. Свабода сумлення і магчымасць абіраць сваю рэлігійную прыналежнасць з'яўляецца адным з базавых правоў чалавека і мы не збіраемся гэта аспрэчваць. Нас цікаваць іншая акалічнасць, дакладней, якім чынам людзі карыстаюцца гэтым правам. Па-першае, далёка не ўсё вернікі адчуваюць патрэбу і неабходнасць у публічнай дэманстрацыі ўласнай веры. Па-другое, часам з'яўляюцца абмежаванні на публічную дэманстрацыю рэлігійных сімвалаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Напэўна, найбольш значным прыкладам гэтага абмежавання можа быць прапанова ў этычным кодэксе беларускіх лекараў забараніць насіць нацельныя крыжыкі на працоўным месцы. Але давайце зразумеем, якія магчымасці і абмежаванні на гэты конт мы можам знайсці ў сацыяльных сетках?

Так карыстальнікі ВК маюць магчымасці абраць сваю рэлігійную ідэнтычнасць проста праз вызначэння ўласных перакананняў, а дакладней – вызначыўшыся рэлігійнымі поглядамі. Для гэтага прадугледжаны даволі шырокі спіс варыянтаў (менавіта ў такой паслядоўнасці): іўдаізм, праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм, іслам, будызм, канфуцыянства, свецкі гуманізм і пастфарыянства (вера у макароннага монстра). Лёгкасць з якой магчыма трансфармаваць свой рэлігійны статус – проста змяніць варыянт у анкеце відавочна, што сведчыць пра дэвальвацыю пэўнай рэлігійнай практыкі.

2) практыка / сімуляцыя. Вельмі няпростым пытаннем з'яўляецца колькасць вернікаў. Статыстыка звычайна мае справу выключна з абстрактнымі лічбамі, якія пазбаўлены рэальнай практыкі. І таму колькасць венікаў, якія прытрымліваюцца абрадаў у адпаведнасці з рэлігійнай традыцыяй і проста колькасць вернікаў (відавочна), што гэта вельмі розныя лічбы. Для карыстальнікаў сацыяльных сетак дастаткова пазначыць у профілі свае перакананні і не трэба аніякіх дадатковых доказаў. Да іншых перакананняў адносяцца наступныя пытанні, з адказамі на якія варта вызначыцца: галоўнае ў жыцці; галоўнае ў людзях; стаўленне да курэння і стаўленне да алкаголю.

Але ж любая практыка, у тым ліку і рэлігійная, патрабуе няспыннага пацвярджэння. У выпадку віртуальнай рэлігійнасці, традыцыйная практыка замяняецца сімулякрамі ў выглядзе тэматычных прывабных медыя прадуктаў (сцікерамі, віртуальнымі паштоўкамі і інш.). Калі звычайна ў стужках такіх карыстальнікаў дамінуюць умоўныя коцікі, то па рэлігійных святах адпаведныя віншаванні і паштоўкі. Фактычна, рэлігійнасць гэтага тыпу пазбаўлена практычнага боку, а ўсё пераўтвараецца ў камунікацыйную гульню.

3) штодзённасць / будучыня. Напэўна, гэты параметр непасрэдна звязаны з рэлігійным светапоглядам, які ўплывае на вызначэнні галоўнага ў жыцці, пошуку арыенціраў ці гэта каштоўнасці сённяшняга дня альбо спакой і шчасце пасля жыцця. Пабудова ідэнтычнасці гэта далёка не заўсёды арыентацыя на будучыню, часам будучыня можа ўспрымацца як працяг мінулага ці вечнае сёння. Кожная рэлігія прапануе чалавеку свой варыянт таго, што будзе пасля жыцця. Але ж для актыўных карыстальнікаў сацыяльных сетак гэта не самае актуальнае пытанне, бо важна вырашыць: «Што ж адбудзецца з маім акаўнтам на Facebook, калі мяне не стане?» – адказу на гэта пытанне прысвечаны адпаведны пункт дапамогі карыстальнікам Facebook. Тут няма месца рэлігійным хваляванням пра душу, бо аб'ектам з'яўляецца на асоба чалавека, а ўліковы запіс. Ёсць шмат цікавых іншых пытанняў, як і хто можа кіраваць акаўнтам памерлага чалавека ці як ператварыць свой акаўнт у месца смутку і памяці, фактычна стварэння віртуальных могілак і мясцін памяці.

Але нас цікавіць, якім чынам гэтыя практыкі віртуальнага рэлігійнага самавызначэння уплываюць на нас па-за межамі інтэрнэту. Амерыканская даследчыца Ш. Таркл азначае, што калі б нашы віртуальныя профілі ў літаральным сэнсе ажылі, то яны нагадвалі малюнкамі з тэстаў Роршаха. Але ж гэты хаос не перашкаджаем нам «выкарыстоўваць віртуальнасць, каб адлюстраваць тое, што сканструктыўнавана ў рэальнасці» [3, с. 647]. Іншымі словамі і ў дачыненні да нашага асноўнага пытання,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэта магчыма перафармуляваць: што лепш сведчыць пра наша стаўленне да рэлігіі: анлайн паштоўкі, статусы і паведамленні з аднаго боку, ці штодзённая практыка – з іншага?

Заўважым, што пры гэтым дэманстрацыйная рэлігійнасць не вельмі істотна адрозніваецца ад дэманстрацыйнага спажывання. Таму ў сваю чаргу магчымым адказам можа быць хваля антыклерыкалізму. На думку М. Энгстрём «Спецыфікай лічбавага антыклерыкалізму з'яўляецца актыўнае выкарыстанне ананімных гібрыдных жанраў інтэрнэт-камунікацыі, блізкіх да палітычнага фальклору» [2, с. 102].

Нават адмаўленне ў значнасці рэлігійнай традыцыі магчыма разглядаць як элемент для пабудову ўласнай культурнай ідэнтычнасці. Мы паспрабавалі разгледзець у першым набліжэнні сітуацыю публічнай дэманстрацыі ў віртуальнай прасторы рэлігійнай прыналежнасці, як элемента для пабудовы культурнай ідэнтычнасці асобы, якая выбудоўвае сваю прысутнасць у анлайне.

**Литература**


1. *Медведева, Е.Н.* Проблема формирования религиозной идентичности в киберпространстве / Е.Н. Медведева // Научные ведомости БелГУ. Серия: Философия. Социология. Право. – 2009. – № 8(63). – С. 72–78.
2. *Engstrom, M.* Постсекулярность и цифровой антиклерикализм в Рунете / M. Engstrom // Digital Icons: Studies in Russian, Eurasian and Central European New Media. – 2015. – Т. 14. – С. 73–108.
3. *Turkle, S.* Cyberspace and Identity / S. Turkle // Contemporary Sociology. – No. 6 – Vol. 28. – 1999. – С. 643–648.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова